УДК 616.89

# ЗНАЧЭННЕ ПРЫНЦЫПА СІМЕТРЫІ Ў ДАСЛЕДАВАННІ КУЛЬТУРАЛЬНА АБУМОЎЛЕНЫХ І ПАТАЛАГІЧНЫХ ПСІХІЧНЫХ ФЕНОМЕНАЎ

[1,2]Цяцеркіна Т.І., [3]Корсак В.У., [1]Сагайдак Дз.І., [2]Гелда А.П.

*[1]НМУ ДУ «Рэспубліканскі цэнтр праблем чалавека», г. Мінск,*
*[2]ДУ «РНПЦ псіхічнага здароўя», г. Мінск,*
*[3]Беларускі дзяржаўны педагагічны універсітэт імя М.Танка, г. Мінск*

Агульнанавуковы прынцып сіметрыі, пад якім насамрэч мяркуюць адзінства асіметрыі і сіметрыі, мае фундаментальную законатворную сілу, паколькі гэтыя паняцці азначаюць спарадкаванасць у жывой і нежывай прыродзе ў супралегласць хаосу. Калі ў пэўных аб'ектах рэгулярна праяўляюцца сіметрыя або асіметрыі, то тое, што фенаменалагічна адбываецца з аб'ектамі, дасягае узроўню закону.

Прынцып сіметрыі адносна нядаўна быў уведзены ў вывучэнне тэарэтычных аб'ектаў, у тым ліку, псіхічнай дзейнасці чалавека. Так, у 90-х гадах мінулага стагоддзя Н.Н. Брагіна, Т.А. Дабрахотава паказалі, што ўспрыманне, эмоцыі, памяць, думанне, свядомасць і звязаныя з імі маторныя і сенсорныя функцыі чалавека арганізаваны ў прасторы і часе асіметрычна, і галоўным чыннікам тут выступаюць індывідуальныя прастора і час і асіметрыя мінулага – будучыні [1].

У апошнія гады ўвага звяртаецца на пэўнае падабенства некаторых культуральна абумоўленых псіхічных феноменаў і тых, што назіраюцца пры псіхічнай паталогіі, на што есць указанні ў Міжнароднай класіфікацыі псіхічных хваробаў (МКБ-10, 1994).

Намі выказана меркаванне, што падабенства феноменаў, калі яны адпавядаюць прынцыпу сіметрыі, можа сведчыць аб агульных заканамернасцях, што ляжаць у іх аснове. Аб'ектамі для параўнання намі абраны, з аднаго боку, такі прадукт калектыўнай псіхічнай дзейнасці як традыцыйныя апатрапеічныя (аберагальныя) тэксты, у якіх адлюстравана ірацыянальнае мысленне людзей, з другога – шызафрэнія, найбольш яскравае псіхічнае расстройства, у самой назве якога крыецца "расшчапленне розуму", што сведчыць аб актуальнасці прынцыпа сіметрыі ў патагенэзе хваробы. Тым больш, што існуюць меркаванні, што і архаічнае мысленне, і тое, што ляжыць у аснове брэдавых пабудоў, адносяцца да паралагічнага думання [2], а забабоны ўяўляюць сабой "брэд" нармальных людзей [3]. Даследаванне

закранае далікатную праблему маргінальнасці псіхічных асаблівасцяў, акрэсленых культуральнымі рамкамі, з аднаго боку, і пераўзыходзячых межы нармальнага функцыяніравання – з другога.

Прынцып сіметрыі знаходзіць свае выражэнне праз прасторава-часавыя характарыстыкі аб'ектаў. У тэкстах абярэгаў апісаны тры асноўныя прасторава-часавыя сферы, якія паўтараюць архаічныя касмаганічныя ўяўленні пра трох'ярусную пабудову свету. Акрамя рэальнага свету жывых, у перажываннях суб'ектаў апатрапеічных рытуалаў існуюць дзве супрацьлеглыя прасторава-часавыя пабудовы.

*Ідэальная, сакральная прастора* – прастора, дзе ўсе ўяўляецца дасканалым, ідэальна зладжаным, сіметрычна пабудаваным. У абярэгах ідэальная прастора прадстаўлена сваімі элементамі: рафінаванымі, правільнымі рытуальнымі рухамі, суб'ектамі з рознай ступенню сакральнасці іх статусу, сакральнымі сродкамі, у тым ліку, магічнымі сімваламі (такімі як круг, квадрат, дуга і г.д.), сакральнымі локусамі. Са станоўчымі характарыстыкамі звязваліся верх, пярэдняя і правая часткі прасторы. *Прастора дэрэалізаванага свету* ўяўляецца люстрана сіметрычнай да рэальнай і выразна адмяжоўваецца ад яе. У антыпрасторы, як лічыцца, пануюць прадстаўнікі "нячыстага" свету. Праявамі інфернальнага ў свеце жывых лічыліся *ніжнія, левыя, заднія, ценявыя* месцы ў прасторы. Прастора іншасвету ўяўлялася небяспечнай, яна выступае ў тэкстах як *прастора-агрэсар*.

*Ідэальны, сакральны час* прадстаўлены светлавым днем, калі нячыстыя сілы, у разуменні людзей, маюць мінімальную актыўнасць; *дэрэалізаваны, скажоны час* іншасвету – начным часам сутак, калі, як лічыцца, пануюць тагасветныя сілы. Час антысвету ў абярэгах уяўляецца бягучым наадварот, што праяўляецца рухамі людзей, арганізаванымі ў рытуалах у зваротнай паслядоўнасці, паводзінамі, супрацьлеглымі прынятым у грамадстве. Час антысвету атаясамліваецца з небяспекай і ўспрымаецца як *час-агрэсар*.

Сакральныя прастора і час у перажываннях пацыентаў, хворых шызафрэніяй, мала прадстаўлены, а сіметрыя тут не азначае ўпарадкаванасці, зладжанасці, а атаясамліваецца з аднаабразнасцю і статычнасцю, прыналежнымі нежывому [4].

І наадварот, дэрэалізаваны, скажоны свет у перажываннях пацыентаў разрастаецца да неабмежаваных памераў.

Усе негатыўнае, што адбываецца з пацыентамі, хворымі на шызафрэнію, можна назваць *антысветам*. Апошні нібыта "апаноўвае" самога чалавека і яго асяроддзе. У выніку адчування пагрозы ад навакольнага свету ў хворых мяняецца ўспрыманне прасторы і часу, наступае іх дэрэалізацыя, якая суправаджаецца перажываннем уласнай смерці і гібелі свету. Частымі з'яўляюцца выказванні пацыентаў накшталт: "мяне няма", "унутры нічога няма, згнілі ўнутраныя органы", "я мярцьвяк". Сам хворы, асабліва той, які знаходзіцца ў кататанічным ступары, сваім нерухомым позіркам, маўчаннем

і скарчанелымі мышцамі можа нагадваць пра нежывое. Яскравай "антысветнай" з'явай пры кататаніі выступаюць рэха-феномены, якія ў фальклорных тэкстах увасабляюць сабой прамы кантакт з пазабаковым, залюстраным светам (рэха – гэта нібыта сігнал "адтуль"). Хворыя шызафрэніяй гавораць аб сваіх кантактах з "тым светам" і яго персанажамі, заяўляюць, што імі авалодалі пазабаковыя сілы, "унутры сядзіць д'ябал, які загадвае рабіць дрэннае". У сваіх перажываннях яны сутыкаюцца з дэманічнымі персанажамі, размаўляюць з мертвымі.

Параўнанне і правядзенне пэўных аналогій паміж перажываннямі здаровых прымхлівых людзей, з аднаго боку, і псіхічна хворых – з другога, з прыцягненнем прынцыпа сіметрыі, могуць дапамагчы праліць святло на базавыя моманты фарміравання псіхічных працэсаў чалавека і іх парушэнняў пры псіхічнай паталогіі.

**Літаратура:**


1. Брагина, Н.Н. Функциональные асимметрии человека / Н.Н. Брагина, Т.А. Доброхотова. – М.: Медицина, 1988. – 240 с.
2. Колпаков, В.Г. Генетические и эволюционные проблемы психиатрии / В.Г. Колпаков, М.С. Рицнер, Н.А. Корнетов и др. – Новосибирск: Наука. Сиб. отд.-ние, 1985. – 255 с.
3. Ясперс, К. Общая психопатология / К. Ясперс // Педагогическая библиотека [Электронный ресурс]. – 2009. – Режим доступа: http://www.pedlib.ru/Books/3_0296-1.shtm. – Дата доступа: 17.09.2009.
4. Цяцеркіна, Т.І. Міфатворчасць і стэрэатыпіі ў этнакультуры і пры псіхічных расстройствах / Т.И. Тетеркина, В.У.Корсак // Психотерапия и клиническая психология. – 2010. – № 1(32). – С. 33-43.


**THE VALUE OF SYMMETRY PRINCIPLE IN LEARNING OF CULTURALLY BASED AND PATHALOGICAL PSYCHIC PHENOMENA**

Tsiatserkina T.I., Korsak V.U., Sagajdak D.I., Gelda A.P.

*On materials of learning of apothropeic texts and the mental status of patients with schizophrenia the value of symmetry principle in research of culturally based and pathological psychic phenomena for formation of base mental processes of the person and their disturbances in mental pathology is shown.*